# КАБ НЕ ЗАГРАЗНУЦЬ У СМЕЦЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але гаворка не пра культуру і эстэтыку, найбольш — пра здароўе. Менавіта на здароўе аказвае прамы ўплыў такое бяздумнае забруджванне прыроды. Для фарбы, як ужо гаварылася, замежныя вытворцы выкарыстоўваюць самыя розныя кіслоты, лічы, атруту. Калі яна трапіць у зямлю, то праляжыць там дзесяцігоддзі і можа вярнуцца да нас з вадой, ежай — як жывёльнага, так і расліннага паходжання. Тут ужо ўся надзея на перапрацоўку і гэтых, і іншых, самых розных адходаў, якіх мы выпрацоўваем у працэсе жыццядзейнасці з кожным годам усё больш.

У Брэсце, пачынаючы з 2012 года, спецыялізаванае прадпрыемства сартуе і перапрацоўвае бытавыя адходы. З іх атрымліваюць электрычную і газавую энергію, здабываюць сыравіну для далейшай вытворчасці. У цэлым па вобласці паказчык выкарыстання цвёрдых бытавых адходаў складае 36,6 працэнта. Але ж застаюцца рэгіёны, дзе адходы пакуль што цалкам вывозяцца на палігоны.

— Мясцовыя органы ўлады, дэпутаты ўсіх узроўняў адказваюць за арганізацыю работы з адходамі. Гэта даволі складаная і разнапланавая праблема. У нашай вобласці 2150 населеных пунктаў. Фактычна ў кожным выбудавана сістэма па зборы, сартаванні, утылізацыі адходаў. Але ж работу трэба ўдасканальваць, даводзіць да лагічнага завяршэння ў выглядзе глыбокай перапрацоўкі, — сказаў **старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, сенатар Юрый НАРКЕВІЧ**. — Гэтае пытанне мы не так даўно абмяркоўвалі на пасяджэнні экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі, які праходзіў у Баранавічах.

Гаспадары пасяджэння тады дзяліліся вопытам і планамі. На савеце адзначалася, што ў Брэсцкай вобласці выбудавана канцэпцыя па рабоце з камунальнымі адходамі. Неўзабаве ў рэгіёне будуць уведзены ў эксплуатацыю чатыры рэгіянальныя комплексы. Напрыклад, у брэсцкую зону ўваходзяць Брэст, Брэсцкі, Жабінкаўскі, Маларыцкі і Камянецкі раёны. Названы комплекс, аснову якога складае Брэсцкі смеццеперапрацоўчы завод, ужо дзейнічае. Сюды прывозяць ЦБА з абласнога цэнтра і яшчэ з трох раёнаў. Маларыцкі раён далучыцца пасля таго, як палігон на тэрыторыі раёна будзе запоўнены. Вядуцца работы па пінскай і баранавіцкай зонах.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

У Баранавічах правялі мадэрнізацыю сартавальнага комплексу, у выніку яго магутнасці павялічаны ўдвая. Гэта дазволіць сартаваць адходы з Баранавіцкага, Ляхавіцкага, Ганцавіцкага раёнаў. З пачатку гэтага года ЦБА акрамя горада прывозяць з тэрыторыі Баранавіцкага раёна. Далучэнне астатніх раёнаў будзе ісці паступова па меры падрыхтоўкі аб'екта. Работу запланавана завяршыць у наступным годзе за кошт сродкаў абласной інвестыцыйнай праграмы і ўдзелу аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў.

Тым часам рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя для пінскай зоны. Там ідзе рэканструкцыя палігона цвёрдых бытавых адходаў. На ўсё чакаецца выдаткаваць каля 100 мільёнаў рублёў. Зона ахоплівае Пінск і Пінскі раён, а таксама Іванаўскі раён.

Рэгіянальны комплекс па сартаванні і выкарыстанні цвёрдых адходаў неўзабаве з'явіцца і ў Кобрыне. Сюды павязуць смецце таксама з Драгічынскага і Пружанскага раёнаў. Распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі на названы комплекс пачнецца сёлета.

За апошнія дзесяцігоддзе аб'ём нарыхтоўкі цвёрдых бытавых адходаў у вобласці вырас у некалькі разоў. Калі, напрыклад, у 2010 годзе іх нарыхтавалі 13,8 тысячы тон, то летась лічба была 106,6 тысячы тон. Для сартавання смецця выкарыстоўваецца 22 тысячы спецыяльных кантэйнераў, а зборам і выманнем другасных рэсурсаў займаецца 14 аб'ектаў гаспадарання. З увядзеннем у строй названых комплексаў, несумненна, паказчыкі перапрацоўкі ў разы вырастуць на карысць аздараўлення навакольнага асяроддзя. І ўсё ж...

Сітуацыя з зямлёй, вадой, паветрам не цалкам залежыць ад сістэмы і якасці перапрацоўкі. Яна залежыць ад дакладнай работы многіх структур і свядомасці суайчыннікаў. Пра шматлікія парушэнні, выяўленыя Брэсцкім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, гаварылі на пасяджэнні аблвыканкама на гэтым тыдні. **Старшыня камітэта Ян ВЯНСКОВІЧ** прывёў прыклады парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства ў Івацэвіцкім і Пінскім раёнах, калі своечасова не вывозяцца адходы і не ліквідуюцца стыхійныя звалкі. Зноў гаворка зайшла пра гурбы смецця на вясковых могілках. Як вядома, большую частку гэтага смецця складаюць вянкі і штучныя кветкі.

Дарэчы, гэтай вясной перад Радаўніцай Мінпрыроды зноў выступіла з заклікам адмовіцца ад упрыгожвання месцаў спачыну штучнымі кветкамі. Але ж неяк дзяжурна і не вельмі ўпэўнена прагучаў голас галоўнага прыродаахоўнага ведамства. Відавочна, што больш настойлівая павінна быць прапаганда, больш шырокая тлумачальная работа.

Скажам, адзін святар у Драгічынскім раёне аб'явіў, што не будзе асвячаць магілы са штучнымі кветкамі. І людзі хутка знайшлі замену шкоднаму пластыку пры добраўпарадкаванні. І калі аблкамітэт аховы прыроды ў ходзе падрыхтоўкі да выканкама прыняў пэўныя меры, многае было выпраўлена вельмі аператыўна. Заадно з развіццём перапрацоўкі трэба шукаць шляхі памяншэння аб'ёму адходаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «ЛЕТА Ў РАДАСЦЬ СА «ЗВЯЗДОЙ»!»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Лета ў радасць са «Звяздой»!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 1 чэрвеня 2023 года да 30 верасня 2023 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2023 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Лета ў радасць са «Звяздой»!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт., з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Камплект садовай мэблі Sundays LUC-TA21 (далей — суперпрыз) | 1 | 299,00 | 299,00 |
| 2 | Набор садовага інструменту WMC Tools TG1001001 (далей — прыз) | 7 | 49,93 | 349,52 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Лета ў радасць са «Звяздой»!» складае: 648,52 (шэсцьсот сорак восем) рублёў пяцьдзясят дзве капейкі.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Лета ў радасць са «Звяздой»!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2023 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2023 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 чэрвеня да 12 ліпеня 2023 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 чэрвеня да 12 ліпеня 2023 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 20 ліпеня 2023 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні «Лета ў радасць са «Звяздой»!» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі.

Члены Камісіі:

Южык Жанна Міхайлаўна — галоўны тавараэнавец РУП «Белдрук»;

Ганцарэвіч Святлана Міхайлаўна — загадчык аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 21 ліпеня 2023 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз (суперпрыз), лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 29 ліпеня 2023 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 29 ліпеня 2023 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2023 года.

Пры звартанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2023 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2023 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 верасня 2023 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, з панядзелка па суботу (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах (017) 271 81 53, 311 17 40, для атрымання пропускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 верасня 2023 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьках, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Лета ў радасць са «Звяздой»!» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах:

(017) 271 81 53, 311 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4317 ад 12.05.2023 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.